# Рашэнне праблем бібліятэк у карпаратыўным уздзеянні

**Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі** Беларусі:

- У развіцці бібліятэчнай справы ў мінулым годзе былі характэрныя як станоўчыя, так і адмоўныя тэндэнцыі, многія з якіх маюць шматгадовую гісторыю. Па-ранейшаму захоўваецца адмоўная дынаміка колькасці бібліятэк. Аднак гэтая тэндэнцыя не новая, яна пазначылася яшчэ ў сярэдзіне 1970-ых гадоў. І звязана яна ў першую чаргу са скарачэннем колькасці вясковага насельніцтва. У бібліятэку прыходзяць перш за ўсё за новай інфармацыяй, разам з тым колькасць новых паступленняў у публічныя бібліятэкі не павялічваецца, а знаходзіцца на ўзроўні 1999 года. Трохі іншая сітуацыя толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і абласных бібліятэках, якія атрымліваюць абавязковы экземпляр. Змянілася і структура новых паступленняў. У многіх бібліятэках яны звяліся практычна да перыядычных выданняў.

На працягу апошніх гадоў вядзецца аўтаматызацыя бібліятэк. Зараз у аўтаматызаваным рэжыме працуе 136 са 139 цэнтральных бібліятэчных сістэм. Усе абласныя бібліятэкі ствараюць электронныя каталогі, да іх стварэння прыступіла амаль 98 % ЦБС. Электроннай поштай карыстаюцца 55 бібліятэк рэспублікі, 8 бібліятэк маюць свае сайты ў Інтэрнеце. Ідзе працэс уключэння публічных бібліятэк у сістэму прававой асветы насельніцтва. На пачатак 2005 г. ў бібліятэках краіны працуе 143 цэнтра прававой інфармацыі.

Рашэнне ж праблем бібліятэк мне бачыцца ў карпаратыўным узаемадзеянні. Дарэчы, у многіх краінах свету дпя абслугоўвання жыхароў маланаселеных пунктаў выкарыстоўваюцца, так бы мовіць, перасоўныя бібліятэкі. Увядзенне ў дзеянне новага будынка Нацыянапьнай бібліятэкі Беларусі створыць умовы для карпаратыўнага фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рхурсаў як на ўзроўні буйнейшых бібліятэк, так і на мясцовым узроўні. Да прыкладу, у школах ствараюцца аб'яднаныя ў лакальныя сеткі камп'ютэрныя класы, якія маюць доступ у Інтэрнет. Гэта неабходна выкарыстаць і як магчымасць доступу ўсіх жыхароў дадзенага населенага пункта да інфармацыйных рэсурсаў буйных бібліятэк рэспублікі. Прычым, канцэнтрацыя рэсурсаў у дадзеным накірунку можа забяспечыць доступ жыхароў невялікіх населеных пунктаў да сучасных інфармацыйных крыніц пры малых затратах.